МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
**«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ
ЎНІВЕРСІТЭТ
КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ»**

вул. Рабкораўская, 17, 220007, Мінск
тэл. (017) 222 83 71, факс (017) 222 24 09
E-mail: buk@buk.by

МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ
**«БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ
УНИВЕРСИТЕТ
КУЛЬТУРЫ И ИСКУССТВ»**

ул. Рабкоровская, 17, 220007, Минск
тел. (017) 222 83 71, факс (017) 222 24 09
E-mail: buk@buk.by

09.02.2015 № 01-13/184

на № ____________ ад ____________

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт»

Паважаныя калегі!

Запрашаем Вас прыняць удзел у Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Культурная спадчына рода Агінскіх і яе значэнне для сучаснага развіцця грамадства», прысвечанай 250-годдзю з дня нараджэння выдатнага кампазітара, грамадскага і дзяржаўнага дзеяча Міхала Клеафаса Агінскага, якая адбудзецца **21-22 кастрычніка 2015 года ў г. Маладзечна**.

Да ўдзелу ў канферэнцыі запрашаюцца выкладчыкі, навуковыя супрацоўнікі, дактаранты, аспіранты, магістранты, прадстаўнікі ўстаноў культуры і грамадскіх арганізацый.

Артыкул і заяўку неабходна прадставіць **да 6 красавіка** па электроннай пошце **sapotko.pavel@mail.ru**

**Да пачатку работы канферэнцыі плануецца выдаць зборнік матэрыялаў.**

Удзельнікі будуць мець магчымасць наведаць мясціны М.К. Агінскага ў Маладзечанскім і Смаргонскім раёнах, пазнаёміцца з гісторыка-культурнай спадчынай княжскага рода, а таксама прыняць удзел у літаратурна-музычным вечары.

**Кантактны тэлефон:** +375 29 853-75-98 ***Сапоцька Павел Міхайлавіч***, выкладчык БДУКМ, адказны сакратар Маладзечанскага Мясцовага дабрачыннага фонда «Спадчына Міхала Клеафаса Агінскага».

Дадатак: інфармацыйны ліст (на 3 старонках).

Прарэктар па навуковай рабоце В.Р. Языковіч

Сапоцька +375 29 853-75-98

Зак. 303.

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь,
Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
Установа адукацыі «Маладзечанскі дзяржаўны музычны каледж імя. М.К. Агінскага»,
Маладзечанскі Мясцовы дабрачынны фонд «Спадчына Міхала Клеафаса Агінскага»

**21-22 кастрычніка 2015 года**
**Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя**
**«Культурная спадчына рода Агінскіх**
**і яе значэнне для сучаснага развіцця грамадства»**

Паважаныя калегі!

21-22 кастрычніка 2015 года адбудзецца Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Культурная спадчына рода Агінскіх і яе значэнне для сучаснага развіцця грамадства», прысвечаная 250-годдзю з дня нараджэння выдатнага кампазітара, грамадскага і дзяржаўнага дзеяча Міхала Клеафаса Агінскага і з нагоды аб'яўлення ЮНЭСКА 2015 года Годам М.К. Агінскага.

**Праблемнае поле канферэнцыі:**

- Грамадска-палітычная, навукова-творчая дзейнасць рода Агінскіх;
- Мастацка-творчая дзейнасць М.К. Агінскага;
- Матэрыяльная і духоўная спадчына рода Агінскіх у Беларусі, Літве, Польшы, Расіі і іншых краінах;
- Развіццё міжкультурнага дыялога праз прызму рэпрэзентацыі гісторыка-культурнай спадчыны рода Агінскіх;
- Развіццё творчай асобы ў кардынатах эпохі XVIII-XIX стст.;
- Светапоглядная парадыгма М.К. Агінскага;
- Грамадзянскія ініцыятывы па шанаванню памяці М.К. Агінскага;
- Выкарыстанне спадчыны княжскага рода Агінскіх у ідэйна-выхаваўчай дзейнасці.

Да ўдзелу ў канферэнцыі запрашаюцца выкладчыкі, навуковыя супрацоўнікі, дактаранты, аспіранты, магістранты, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый ў сферы культуры.

Рабочыя мовы канферэнцыі – беларуская, руская.

**Патрабаванні да афармлення матэрыялаў**

Аб'ем – 5-7 старонак. Палі – 2 см. з кожнага боку, шрыфт – Times New Roman, кегль 14, міжрадковы інтэрвал – 1,5, спасылкі на літаратуру ў квадратных дужках. Пры наяўнасці спасылак спіс літаратуры абавязковы (у алфавітным парадку). Афармленне(абавязкова па ўзору): 1-ы радок – у правым верхнім вугле тлустым курсівам: ініцыялы аўтара, прозвішча, 2-і радок – у правым верхнім вугле тлустым курсівам: назва арганізацыі, 3-і радок – у правым верхнім вугле тлустфым курсівам: горад, 4-і радок – пасля адступання выраўноўванне па цэнтры тлустым шрыфтам прапіснымі літарамі: назва артыкула, 5-і радок – пасля адступання выраўноўванне па цэнтры звычайным шрыфтам прапіснымі літарамі анатацыя на англійскай мове (3-4 сказы) (**гл. Дадатак 1**).

Асобным дакументам высылаецца заяўка на ўдзел (**гл. Дадатак 2**).

Артыкул і заяўку неабходна адправіць **да 6 красавіка** па электроннай пошце **sapotko.pavel@mail.ru**

Пацвярджэнне атрымання матэрыялаў для ўдзелу ў канферэнцыі будзе накіравана на працягу 3-х дзён з даты іх атрымання па электроннай пошце. Калі на працягу 3-х дзён адказ не атрыманы, неабходна накіраваць файлы заяўкі і тэкст артыкула паўторна.

**Да пачатку работы канферэнцыі плануецца выдаць зборнік матэрыялаў.**

Удзельнікі канферэнцыі будуць мець магчымасць наведаць мясціны М.К. Агінскага ў Маладзечанскім і Смаргонскім раёнах, пазнаёміцца з гісторыка-культурнай спадчынай княжскага рода, а таксама прыняць удзел у літаратурна-музычным вечары.

Праезд да месца правядзення канферэнцыі і харчаванне – за кошт камандзіруемай арганізацыі, пражыванне, экскурсіі, канцэртная праграма – за кошт арганізатараў.

**Кантактныя тэлефоны:**

+375 29 853-75-98 ***Сапоцька Павел Міхайлавіч***, выкладчык кафедры міжкультурных камунікацый, аспірант кафедры культуралогіі, магістр культуралогіі, адказны сакратар Маладзечанскага Мясцовага дабрачыннага фонда «Спадчына Міхала Клеафаса Агінскага».

Дадатак 1

Прыклад афармлення артыкула

**І.І. Іваноў,**
**Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў,**
**г. Мінск**

**ДЫПЛАМАТЫЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ МІХАЛА КЛЕАФАСА АГІНСКАГА**

Анатацыя на англійскай мове (3-4 сказы).

Асноўны тэкст [].

Літаратура

1.
2.
3.

Дадатак 2

ЗАЯЎКА НА УДЗЕЛ У КАНФЕРЭНЦЫІ

| | |
|---|---|
| Прозвішча, імя, імя па бацьку | |
| Назва арганізацыі (адрас) | |
| Пасада | |
| Вучоная ступень | |
| Вучонае званне | |
| Кантактны тэлефон | |
| E-mail | |
| Неабходнасць у прадстаўленні гасцініцы | |